



30 YEARS OF INDEPENDENCE KAZAKHSTAN

# VIII МЕЖДУНАРОДНАЯ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ

## НАУКА И ОБРАЗОВАНИЕ В СОВРЕМЕННОМ МИРЕ: **ВЫЗОВЫ XXI ВЕКА**

НУР-СУЛТАН, КАЗАХСТАН
2021 ГОД, АПРЕЛЬ

**Объединение юридических лиц в форме ассоциации «Общенациональное движение «Бобек»**

**КОНГРЕСС УЧЕНЫХ КАЗАХСТАНА**

# "SCIENCE AND EDUCATION IN THE MODERN WORLD: CHALLENGES OF THE XXI CENTURY"

атты VIII Халықаралық ғылыми-тәжірибелік конференция

**ЖИНАҒЫ**

# МАТЕРИАЛЫ

VIII Международной научно-практической конференции

# «НАУКА И ОБРАЗОВАНИЕ В СОВРЕМЕННОМ МИРЕ: ВЫЗОВЫ XXI века»

## 11. ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ НАУКИ

## III ТОМ

**НҰР-СҰЛТАН – 2021**

# ЗАГАДКІ ЯК СПОСАБ ФАРМІРАВАННЯ МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ Ў НАВУЧЭНЦАЎ 1 – 4 КЛАСАЎ З ВЫКАРЫСТАННЕМ ТЭХНАЛОГІІ «СУСВЕТНАЕ КАФЭ»

**Шылава Алена Савельеўна**
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ ім. М. Танка,
Мінск, Рэспубліка Беларусь
**Мурашка Наталля Уладзіміраўна**
Магістар, настаўнік пачатковых класаў ДУА «СШ № 196 г. Мінска»
Мінск, Рэспубліка Беларусь

***Анатацыя:*** *праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць разумення яе сутнасці для пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія б спрыялі эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечвалі дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.*

***Ключавыя словы:*** *маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, тэхналогія «Сусветнае кафе», загадкі.*

Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў, выкарыстання інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.

Загадка – гэта кароткае пытанне на кемлівасць, прадстаўленае ў алегарычнай форме, пра апісанне прадметаў, з'яў і зададзенае часцей за ўсё ў забаўляльным ключы. Загадкі даюць уяўленне аб прадмеце ў завуаліраванай форме. Могуць проста апісваць прадмет, не называючы яго, ці распавядаць аб ім з дапамогай апісання падобных рыс іншых прадметаў або аб'ектаў. Практыкаванні ў адгадванні і складанні загадак надзвычайна карысныя. Загадкі спрыяюць развіццю памяці вучняў, слоўнікавага запасу і маўлення, вобразнага мыслення. Загадка вучыць параўноўваць прыкметы розных прадметаў, знаходзіць агульнае ў іх і тым самым фарміруе ў вучня ўменне класіфікаваць прадметы. Акрамя таго, гэта выдатны спосаб камунікацыі паміж дзецьмі ў лёгкай гульнёвай форме.

Адной з найважнейшых задач сучаснага настаўніка пачатковых класаў з'яўляецца ўкараненне ў адукацыйны працэс такіх тэхналогій, з дапамогай якіх ўрок становіцца цікавым і захапляльным для кожнага вучня. Мы апісвалі рэалізацую тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання на прыкладзе прыказак і прымавак [1], а таксама тэхналогію навучання ў супрацоўніцтве на ўроках беларускай мовы [2], таму тут пакажам працу з загадкамі праз выкарыстанне тэхналогіі «Сусветнае кафэ».

Тэхналогія «***Сусветнае кафэ***» з'яўляецца альтэрнатыўнай традыцыйнаму навучанню малодшых школьнікаў; дае магчымасць актывізаваць пазнавальную дзейнасць кожнага навучэнца ў адукацыйным працэсе.

«Сусветная кафэ» (the World Cafe) – гэта спосаб групавога абмеркавання ў натуральнай і расслабленай абстаноўцы [3]. Методыку актыўна выкарыстоўваюць у розных сферах: навучанні, псіхалогіі, бізнэсе, таму што яна мае шэраг пераваг.

Мэтай выкарыстання на ўроках тэхналогіі «Сусветнага кафэ» з'яўляецца стварэнне магчымасці для зносін навучэнцаў 1–4 класаў па пэўнай праблеме, вывучанай тэме або раздзелу праграмы, для развіцця іх маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Задача ўдзельнікаў «Сусветнага кафэ» – паўтарыць, замацаваць, абагульніць вывучаны матэрыял, сабраць па магчымасці максімальны аб’ём інфармацыі: уражанняў, меркаванняў і ацэнак па пэўнай праблеме.

Дадзеная тэхналогія з’яўляецца эфектыўнай на ўроках абагульнення і сістэматызацыі ведаў. Для яё рэалізацыі на ўроку настаўнік павінен ператварыць клас у кафэ: расставіць імправізаваныя столікі і падрыхтаваць спецыяльнае абсталяванне.

Пакажам магчымасці рэалізацыі тэхналогіі «Сусветная кафэ» на адным з урокаў літаратурнага чытання у трэцім класе, калі навучэнцы абагульнялі веды па малым жанрам вуснай народнай творчасці ў канцы навучальнага года.

*Трэба адзначыць, што навучэнцы з 1 класа вялі «фальклорную скарбонку» – невялікі блакнот, куды запісвалі скорагаворкі, прыказкі і прымаўкі, загадкі, вывучаныя імі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання і сістэматычна працавалі з малымі жанрамі вуснай народнай творчасці, таму абраная намі тэма для рэалізацыі тэхналогіі «Сусветная кафэ» не з’яўляецца для іх складанай.*

***Абсталяванне:*** карткі з назвай сталоў у імправізаваным кафэ («Загадкі пра жывёл», «Загадкі пра з’явы прыроды», «Загадкі пра рэчы»), папера, ручкі, стыкеры, ліст паперы фармата А3 («папяровы абрус») для кожнага «гаспадара стала».

*Колькасць сталоў і іх назва па меркаванню настаўніка можа змяняцца.*

**Этапы рэалізацыі тэхналогіі:**

Перад правядзеннем урока, настаўнік прадумвае, каго з вучняў можна прызначыць «гаспадаром стала», і тлумачыць ім іх абавязкі:

- ✓ ветліва сустракаць гасцей;
- ✓ тлумачыць гасцям, якое заданне яны павінны выканаць і як павінны прадставіць вынікі працы;
- ✓ пры неабходнасці аказваць некаторым навучэнцам дапамогу ў падрыхтоўцы выканання задання;
- ✓ як фіксаваць вынікі працы кожнай групы.

**Першы этап.** Настаўнік складае спіс з трох тэм, якія фіксуюцца на дошцы або слайдзе, напрыклад:

1) **Загадкі пра жывёл** (стол № 1);
2) **Загадкі пра з’явы прыроды** (стол № 2);
3) **Загадкі пра розныя рэчы** (стол № 3).

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае навучэнцаў на ***тры групы*** з дапамогай картак рознага колеру: чырвонай, жоўтай або зялёнай, якія яны бяруць са стала настаўніка; рассаджвае іх за сталы; знаёміць з асаблівасцямі працы, правіламі і вынікам, які павінны дасягнуць ўдзельнікі кожнай групы. Акрамя таго, настаўнік раздае кожнай групе ўпакоўку стыкераў, якія застануцца з гэтай групай на працягу ўсяго ўрока: групе чырвоных – чырвоныя стыкеры, жоўтых – жоўтыя стыкеры, зялёных – зялёныя стыкеры.

**Трэці этап.** Удзельнікі кожнай групы атрымліваюць назву групы па колеру абранага стыкеру: «Чырвоныя», «Жоўтыя», «Зялёныя»; настаўнік прызначае вучняў, якія будуць выконваць ролю «гаспадара стала».

«Гаспадар стала» кожнай групы выходзіць да дошкі і са стала настаўніка бярэ адзін з пранумараваных канвертаў (№№ 1, 2, 3), у якім прапісана тэма і заданне, якія ўдзельнікі групы павінны будуць выканаць, калі прыйдуць за яго стол.

***Заданне для ўдзельнікаў групы за сталом № 1:***
***«Загадкі пра жывёл».***

Кожнаму ўдзельніку групы самастойна на працягу 1 хвіліны запісаць на стыкерах свайго колеру як мага больш загадак пра жывёл.

***Заданне для ўдзельнікаў групы за сталом № 2:***
***«Загадкі пра з’явы прыроды».***

Кожнаму ўдзельніку групы самастойна на працягу 1 хвіліны запісаць на стыкерах свайго колеру як мага больш загадак пра з’явы прыроды.

***Заданне для ўдзельнікаў групы за сталом № 3:***

***«Загадкі пра розныя рэчы».***

Кожнаму ўдзельніку групы самастойна на працягу 1 хвіліны запісаць на стыкерах свайго колеру як мага больш загадак пра розныя рэчы.

**Чацвёрты этап – першы раўнд.**

Спачатку «гаспадар» кожнага стала зачытвае заданне і навучэнцы ў групе самастойна прыступаюць да яго выканання, запісваючы кожную загадку ***на асобным стыкеры таго колеру***, які група атрымала ад настаўніка ў пачатку ўрока.

*Настаўнік, ведаючы асаблівасці сваіх вучняў, падыходзіць да тых, каму неабходна падтрымка або дапамога; высвятляе ўзнікшыя цяжкасці, дазваляе, тым, каму неабходна, скарыстацца падказкамі.*

Пасля выканання задання, кожны ўдзельнік групы па чарзе прадстаўляе свае вынікі «гаспадару стала»: спачатку зачытвае свае адказы, запісаныя на стыкерах, а потым аддае стыкеры «гаспадару стала», які прымацоўвае іх на загадзя падрыхтаваны ліст («папяровы абрус» з назвай тэмы). Першы раўнд доўжыцца 5 хвілін. Настаўнік засякае час з дапамогай таймера.

Па заканчэнні першага раўнда кожная група пераходзіць за новы стол, звычайна, па ходу стрэлкі гадзінніка.

**Пяты этап – другі раўнд.**

«Гаспадар стала» сустракае «новых» гасцей, чытае заданне і навучэнцы выконваюць яго, запісваючы на сваіх стыкерах (стыкерах таго колеру, якія яны атрымалі ад настаўніка ў пачатку ўрока).

*Настаўнік вядзе назіранне за працай вучняў, ходзячы вакол столікаў, пры неабходнасці некаторым вучням тлумачыць заданне або аказвае ім неабходную дапамогу.*

Далей «гаспадар стала» просіць усіх вучняў быць вельмі ўважлівымі, спачатку расказвае пра тое, што напрацавана ўдзельнікамі папярэдняй групы: зачытвае выкананыя заданні, запісаныя на стыкерах, і просіць удзельнікаў групы, як толькі яны пачулі загадку, якая таксама і ў іх запісана на стыкеры, адразу падняць руку. «Гаспадар стала», убачыўшы паднятую руку, забірае ў удзельніка стыкер-дублёр і адразу ж прымацоўвае яго паверх стыкера з аналагічным адказам.

Пасля гэтага кожны ўдзельнік групы прадстаўляе свае вынікі «гаспадару стала»: зачытвае адказы, якія засталіся ў яго пасля таго, як былі адкладзены адказы-дублёры, і таксама аддае свае стыкеры «гаспадару стала». «Гаспадар» прымацоўвае іх ліст («папяровы абрус» з назвай тэмы). Другі раўнд доўжыцца 5 хвілін і заканчваецца зменай сталоў.

**Шосты этап – трэці раўнд.**

Аналагічным чынам праводзіцца трэці раўнд.

Вельмі часта трэці раўнд заканчваецца пасля таго, як «гаспадар стала», сустрэўшы ўдзельнікаў наступнай групы, чытае ім усе заданні, запісаныя на стыкерах папярэднімі «гасцямі», і просіць перадаць стыкеры-дублёры з аналагічнымі адказамі. Атрымліваецца сітуацыя, калі амаль усе ўдзельнікі гэтай групы за выключэннем некаторых перадаюць стыкеры з адказамі і не зачытваюць іх. У такім выпадку час затрачаны на правядзенне трэцяга раўнда можа быць значна менш.

**Сёмы этап – падвядзенне вынікаў.** ***«Збор ураджаю»*** праводзіцца тады, калі ўдзельнікі кожнай групы пасядзяць за двума іншымі сталамі і вярнуцца на сваё месца, за стол, з якога яны пачыналі працу. Разам з «гаспадаром стала» ўдзельнікі кожнай групы абмяркоўваюць атрыманыя вынікі і «гаспадар стала» прэзентуе атрыманыя вынікі працы: зачытвае адказы, запісаныя на стыкерах на лісце ўдзельнікамі ўсіх груп, звяртая ўвагу на стыкеры-дублёры – найбольш папулярныя адказы, называючы іх колькасць.

Такая праца дапамагае абагульніць атрыманыя веды, аднавіць у памяці тое, што забылася вучнямі. Настаўнік мае магчымасць убачыць найбольш папулярныя адказы альбо тыя, што часта выкарыстоўваюцца (стыкеры-дублёры) і змяніць фокус увагі з добра вывучанага матэрыяла, на тое, што рэдка ўжываецца на занятках, тым самым пашыраючы кругагляд, узбагачаючы маўленне вучняў і аднаўляючы ў памяці забытую інфармацыю.

**Восьмы этап – рэфлексія.**

Настаўнік прапануе пытанні для абмеркавання:

✓ Ці спадабалася вам быць удзельнікамі «Сусветнага кафэ»?
✓ Ці спадабалася вам як працавалі «гаспадары стала»?
✓ Праца за якім сталом выклікала у вас больш цяжкасцей?
✓ Ці спадабаўся вам прадстаўляць сваю працу?
✓ Што неабходна зрабіць, каб у кожнага з вас не ўзнікалі цяжкасці пры адказах на пытанні па гэтых тэмах?

Такім чынам, тэхналогію «Сусветнае кафэ» можна выкарыстоўваць не толькі на ўроках абагульнення і сістэматызацыі ведаў, але таксама і на ўроках замацавання. Акрамя таго, гэтая тэхналогія эфектыўна не толькі пры вырашэнні праблем развіцця ўменняў навучальнага ўзаемадзеяння навучэнцаў 1–4 класаў, але і спрыяе павышэнню ўзроўню сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі кожнага вучня. Дружалюбная атмасфера ў групе спрыяе беспрымусоваму ўздзеянню і адкрытасці пры выкананні заданняў, так як пры неабходнасці ўдзельнікі адной групы могуць звярнуцца за дапамогай да сваіх сяброў, і ў прадстаўленні вынікаў працы здымае магчымую трывожнасць і скаванасць ў навучэнцаў з нізкім узроўнем матывацыі.

Выкарыстанне на ўроках тэхналогіі «***Сусветнае кафэ***» дазваляе:

✓ павышаць матывацыю ўсіх навучэнцаў 1–4 класаў да ўдзелу ў вучэбнай дзейнасці;
✓ зацікавіць навучэнцаў класа калектыўнай групавой працай;
✓ ствараць умовы для развіцця ўсіх навучэнцаў класа, у тым ліку навучэнцаў з сярэднім і нізкім ўзроўнямі матывацыі;
✓ з дапамогай калектыўных формаў навучальнага ўзаемадзеяння дасягнуць больш эфектыўнага і актыўнага працэсу навучання беларускай мове;
✓ фарміраваць маўленча-камунікатыўную кампетэнцыю;
✓ выкарыстоўваць беларускую мову як сродак зносін;
✓ атрымаць канкрэтныя практычныя вынікі навучання за кароткі перыяд часу;
✓ фарміраваць у навучэнцаў уменне працаваць у групе;
✓ атрымліваць задавальненне ад праведзенай сумеснай працы;
✓ прыносіць кожнаму з навучэнцаў радасць дасягнення пастаўленай мэты;
✓ матываваць на паспяховы працяг вывучэння загадак.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Шылава, А. С. Эфектыўныя шляхі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз прыказкі і прымаўкі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання / А. С. Шылава, Н. У. Мурашка // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. – 2019. – № 12. – С. 7–12.

2. Мурашка, Н. У. Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве на ўроках як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі беларускай мовы ў 1 класе / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. – 2020. – № 8. – С. 25–29.

3. Абашкина, О. Что такое world cafe? / О. Абашкина // Справочник по управлению. – 2011. – № 2. – С. 44–56.

# СОДЕРЖАНИЕ
# CONTENT

**Жұмағазина Анар Аманғазықызы, Аманбекова Дана Куанбеккызы**....................................3
**Абаева Венера Ергалиевна**(Шымкент, Казахстан)……………………………………………….5
**Кенжебекова Рабига Ибрахимовна, Исматуллаева Барно Иляшевна, Алиева Гульнара Тойчиевна**(Шымкент, Казахстан)…………………………………………………………………..11
**Молдабек Құлахмет, Туякова Феруза Сабиржановна, Миркамилова Надира Абдыкаимовна**(Шымкент қ., Казахстан)…………………………………………………….…15
**Жаткамбаева Ж Н, Жумагалиева Ж.Ж., Асаналиев Мелис Казыкеевич** (Кыргызстан)……………………………………………………………………….……………19
**Мусабеков Ондасын Устенович**(г. Алматы, Казахстан)…………………………..………..25
**Гильд Ольга Ивановна** (Караганда, Казахстан)……………………………...…………..……….29
**Хуанган Аягул**(Қарғанды қ., Қазақстан)……………………………………………………..…….32
**Ш.Х. Құрманалина**(Орал, Қазақстан)………………………………………………………..….35
**Орынғали Алмазбек Қадырбекұлы**(Орал, Қазақстан)……………………………………..…..40
**Шылава Алена Савельеўна, Мурашка Наталля Уладзіміраўна**(Мінск, Рэспубліка Беларусь)……………………………………………………………………………………………....45
**Таран Николай Юрьевич, Таран Андрей Юрьевич, Каверин Владимир Викторович, Эм Геннадий Аркадиевич** (Караганда, Казахстан)……….……………………………………..…49
**Lyudmila Trubitskaya, Oksana Protsyuk, Vladimir Belkovich** (Nur-Sultan, Kazakhstan)………52
**Табаракова Жамиля Ержановна**……………………………………………………….............55
**Гончар Наталья Александровна** (Костанай, Казахстан)…………………………………......59
**Сулейменов Олжас, Әшімханов Әл-Қуат, Сеңгірбай Арман**(Тараз, Қазақстан)…………..…63
**Zhunisbekova Dana Alkhanovna, Suigenbayeva Aliya**(Shymkent, Kazakhstan)………………….68
**Жұмабай Диана**(Қарағанды қ., Қазақстан)……………………………………………..…..……72
**Атамуратов Мурат Утепбергенович**…………………………………..…………....76
**Муканова Б.Т., Бакасова А.К.** (Павлодар)...........................................................................79
**Секей Ботагөз**(Алматы қ., Қазақстан)………………………………………......…………....82
**Элбоева Ойзада Жамалбековна**(Тараз, Қазақстан)……………………………..……….....85
**Джафарова Нигара Алифагаевна**(Республика Казахстан, город Алматы)……….……………..88
**Аязбай Айтолқын Сөртібайқызы**(Қарағанды қ., Қазақстан)……………………...…………….93
**Құдабаева Клара Илиясқызы**(Алматы, Қазақстан)……………………….……………….96
**Садыбекова Дана Абдухадырқызы**(Шымкент Қазақстан)……………………………….. 100
**Шажалиев Абдурашид Шакирович**(Алматы қ., Қазақстан)………………………………… 104

Научное издание

# VIII Международная научно-практическая конференция
# «НАУКА И ОБРАЗОВАНИЕ В СОВРЕМЕННОМ МИРЕ: ВЫЗОВЫ XXI века»

Сборник научных статей
Ответственный редактор – Е. Абиев
Технический редактор – Е. Ешім

Подписано в печать 30.04.2021
Формат 190x270. Бумага офсетная. Печать СР
Усл. печ. л. 25 п.л. Тираж 50 экз.